**Шчучыншчына зацікаўлена ў маладых спецыялістах**

У Шчучыне адбылася сустрэча маладых спецыялістаў з кіраўніцтвам раёна і лідарамі моладзі.



Віталій і Вольга Яфрэмавы – нядаўнія выпускнікі Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі, працуюць у філіяле “Жалудоцкі агракомплекс”. Маладых людзей аб’ядноўвае не толькі работа, але і каханне.

– У Шчучынскі раён я трапіў па размеркаванні, – прызнаецца Віталій. – Працаваў загадчыкам майстэрняў. Мне спадабалася гаспадарка і калектыў, таму хутка запрасіў і каханую ў Жалудок. Яна – аграном-насеннявод. Мы пажаніліся. Гаспадарка забяспечыла жыллём. Хутка ў нашай сям’і будзе папаўненне.



Віталій і Вольга – двое з 152 маладых спецыялістаў, якія сёлета прыехалі працаваць на Шчучыншчыну. Па традыцыі штогод у райвыканкаме ладзяцца сустрэчы маладых спецыялістаў, дзе яны могуць не толькі пазнаёміцца адзін з другім, але і ўзняць хвалюючыя пытанні, быць пачутымі раённай уладай.

– Мы паважаем і цэнім маладыя кадры, – зазначыла начальнік аддзела па справах моладзі райвыканкама Таццяна Ганчарук. – Мы лічым, што моладзь – гэта не толькі наша будучае. Сённяшні дабрабыт таксама ствараюць маладыя, выкарыстоўваючы набытыя веды і вопыт старэйшага пакалення, прымяняючы сучасныя тэхналогіі.




У сустрэчы з маладымі спецыялістамі прынялі ўдзел намеснікі старшыні райвыканкама Я.Б. Майсей, М.І. Міхно, кіраўнік спраў – начальнік кіраўніцтва справамі Ю.Т. Пашук, начальнік РАУС А.І. Шастайла, намеснік начальніка аддзела культуры М.І. Мармыш, першы сакратар РК БРСМ А.С. Богдзель і іншыя.

Арганізатары паклапаціліся, каб пасля афіцыйнай часткі сустэчы, моладзь сабралася за “салодкімі” сталамі ў кафэ “Залаты бераг”. Канцэртная праграма, якую падрыхтавалі работнікі РДК, вельмі ўпрыгожыла вечарыну. Вясёлыя песні ў выканні Анастасіі Селішчавай, Дзмітрыя Паваргі, Дзіаны Лукашэвіч і Вольгі Кірылюк усе прынялі на “ўра”.



Прыйшлося маладым спецыялістам самім праявіць свае вакальныя здольнасці ды пачуццё гумару, адным словам, адпачынак удаўся. На памяць ад арганізатараў сустрэчы РК “БРСМ” і аддзела моладзі маладыя спецыялісты атрымалі буклеты пра Шчучыншчыну і сувеніры.